# МОВА РОДНАЯ – ШЛЯХ ДА СЭРЦАЎ

**25 лютага па запрашэнні Гродзенскай гарадской бібліятэкі № 9 у дзяржаўнай установе культуры выступіла маладая паэтэса Вольга Алізар. Літаратурная сустрэча была прысвечана нядаўняму Сусветнаму дню роднай мовы. У аўтарскім выкананні для прыхільнікаў мастацкага слова прагучалі паэтычныя творы на беларускай мове.**



Але, як вядома, адной толькі дэкламацыяй вершаў такія сустрэчы не абмяжоўваюцца. Важны вобраз аўтара (у дадзеным выпадку паэта), вакол якога будуецца агульнае ўражанне і пра тэмы яго творчасці, і пра яго лірычных герояў, а калі гэта чалавек малады, – і пра яго перспектывы. Гродзенскія літаратары даволі часта выступаюць у 9-й бібліятэцы. І кожны раз у знак удзячнасці за вынікі сваёй літаратурнай працы, прадстаўленыя на суд грамадскасці, атрымліваюць шчырую зацікаўленасць і цёплую, сяброўскую сімпатыю.

Не стала выключэннем сустрэча з Вольгай Алізар. Паэтэса мае ў сваім багажы выдадзены персанальны зборнік лірыкі, шэраг публікацый у рэспубліканскім перыядычным друку, мноства перамог у літаратурных конкурсах рознага ўзроўню, займаецца творчасцю вельмі плённа і з'яўляецца кандыдатам на ўступленне ў шэрагі Саюза пісьменнікаў Беларусі. Акрамя таго, з 2024 года Вольга Сцяпанаўна працуе на пасадзе вядучага спецыяліста Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі і ўжо паспела пазнаёміцца з членамі літаратурнай сям'і Прынёманскага краю. Напэўна, самая важная і адказная для госці жыццёвая роля – роля мамы. Вольга выхоўвае траіх дзяцей. Як жа гэта – сумяшчаць такую важную сацыяльную місію мацярынства з амплуа мастака слова, няўрымслівага шукальніка гармоніі сэнсаў і мастацкіх сродкаў? Як гэта – усім сэрцам любіць сваю Радзіму; берагчы, пераймаць і перадаваць моладзі народныя традыцыі; шанаваць мінулае; адстойваць гістарычную праўду; вучыцца ў класікаў, каб усебакова развівацца, рухацца наперад, узбагачаць нашу культурную спадчыну? Адказы на гэтыя і іншыя пытанні пачулі тыя, хто лютаўскім вечарам прыйшоў у бібліятэку на сустрэчу з паэтэсай Вольгай Алізар. Адказы – у шчырай, павольнай размове і ў трапных, мілагучных радках паэзіі на роднай і блізкай для ўсіх прысутных беларускай мове.

І яшчэ адзін факт. Сустрэча з аматарамі мастацкага слова ў гарадской бібліятэцы № 9 стала дэбютным для паэтэсы Вольгі Алізар сольным выступленнем. Павіншуем яе з добрым пачаткам і пажадаем, каб простыя і зразумелыя ўсім словы яе вершаў, натхнёных вобразам Беларусі, народным жыццём, пачуццём любові да навакольнага свету, і надалей выклікалі святло ў вачах людзей і цёплыя ўсмешкі на тварах.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На фота:** у межах Тыдня роднай мовы ў Гродзенскай гарадской бібліятэцы № 9 выступіла маладая паэтэса Вольга Алізар. 25 лютага 2025 года.





Пасля мерапрыемства

